9. НАРБ. – Фонд 242п. – Оп. 1. – Д. 475.
10. НАРБ. – Фонд 242п. – Оп. 1. – Д. 500.
11. НАРБ. – Фонд 242п. – Оп. 1. – Д. 582а.
12. НАРБ. – Фонд 242п. – Оп. 1. – Д. 596.
13. НАРБ. – Фонд 242п. – Оп. 1. – Д. 599 а.
14. Hass, L. Ruch związkowy w Rzeczypospolitej / L. Hass // Z dziejów Drugiej Rzeczypospolitej. – Warszawa: Ksiązka i wiedza, 1986. – S. 248–289.
15. Pilch, A. Glowne kierunki ruchu zawodowego w Polsce / A. Pilch // Kwartalnik Historii Ruchu Zawodowego. – 1982. – № 3–4. – S. 3–15.
16. Sprawy Narodowościowe / Warszawa: Instytut Badań Spraw Narodowościowych. – 1937. – № 3.

## ДА ВЫТОКАЎ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ: СУПЯРЭЧНАСЦІ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ Ў ЦЭНТРАЛЬНА- ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1920-х ГАДОЎ

***Мязга М.М.***
УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны», г. Гомель

Пасля завяршэння Першай сусветнай вайны краіны-пераможцы стварылі новую сістэму міжнародных адносін, якая павінна была забяспечыць непаўтарэнне ваеннай катастрофы, падобнай той, якая адбылася ў 1914–1918 гг. Аднак з моманту свайго стварэння Версальская сістэма міжнародных адносін несла ў сабе цэлы комплекс вострых супярэчнасцяў. Рэгіёнам, у якім з самага пачатку гэтыя супярэчнасці праявіліся з асаблівай вастрынёй, была Цэнтральна-Ўсходняя Еўропа. Міжнароднае становішча тут вызначалася перш за ўсё ўзаемаадносінамі паміж Савецкай Расіяй (СССР), Германіяй і Польшчай. Гэтыя краіны занялі рознае месца ў Версальскай сістэме, што вызначыла іх рознае стаўленне да яе і параджала найбольш значныя супярэчнасці ў рэгіёне. Развіццё гэтых супярэчнасцяў на працягу 20–30-х гг. ХХ стагоддзя прывяло ў рэшце рэшт да таго, што менавіта ў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропе 1 верасня 1939 г. успыхнула полымя Другой сусветнай вайны. Таму для вывучэння перадумоў, якія прывялі да яе ўзнікнення, вялікае значэнне мае вывучэнне ўзаемаадносін паміж Савецкай Расіяй, Польшчай і Германіяй у першыя гады існавання Версальскай сістэмы, калі афарміліся асноўныя супярэчнасці паміж гэтымі краінамі. Мы абмяжуем верхнюю хранолагічную мяжу нашага даследавання падпісаннем Лакарнскіх пагадненняў, якія істотна змянілі міжнародную сітуацыю ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Такім чынам, мэтай дадзенай работы з'яўляецца выяўленне тых супярэчнасцяў, якія сфарміраваліся ў адносінах паміж Савецкай Расіяй, Германіяй і Польшчай у першыя гады існавання Версальскай сітэмы, і іх ролі ва ўзнікненні Другой сусветнай вайны.

Дадзеная праблема знайшла пэўнае адлюстраванне ў савецкай, расійскай, польскай, германскай і беларускай гістарыяграфіі. Пры вывучэнні савецка-германскіх адносін савецкая гістарыяграфія, як і гістарычная навука ГДР і ПНР, зыходзіла з таго, што рапальскі курс з'яўляўся практычным увасабленнем савецкай палітыкі мірнага суіснавання. Такі пункт гледжання адлюстраваны ў работах А. Ахтамзяна [1], С. Мікуліча [2], В. Руге [3], [4]. Замоўчваліся антыверсальскі і антыпольскі аспекты гэтай палітыкі. Германская немарксісцкая гістарыяграфія адстойвала пункт гледжання, згодна якому рапальская палітыка служыла інтарэсам рэвізіі Версаля [5; 6]. Польская немарксісц-

кая гістарыяграфія яшчэ ў міжваенны час сфарміравала канцэпцыю «геапалітычных цiскоў», якія для Польшчы стварылі Расія і Германія. Адпаведна, палітыка Рапала разглядалася як непасрэдная пагроза для польскай дзяржавы [7].

Пасля падпісання Версальскага, а затым і Рыжскага дагавора, у адносінах паміж Савецкай Расіяй, Германіяй і Польшчай адным з найбольш спрэчных заставалася пытанне аб граніцах, якія ўсталявалі гэтыя дагаворы. У час падрыхтоўкі Рыжскага мірнага дагавора польская дэлегацыя, па словах яе сакратара Ю. Гласка, імкнулася ўсталяваць такую граніцу, якая не падагравала б расійскія нацыяналістычныя настроі [8, с. 40]. Гэтую пазіцыю найбольш актыўна адстойваў у Рызе С. Грабскі, чый уплыў на ход перамоў быў найбольш значным. Разлік С. Грабскга на тое, што ўсталяваная савецка-польскім мірным дагаворам граніца задаволіць расійскі ўрад любой палітычнай арыентацыі, быў неапраўданы. Граніца прайшла значна ўсходней польскай этнічнай мяжы, і з ёй не мог змірыцца ўрад Расіі будзь то савецкай, ці постсавецкай. У савецкай палітыцы ўжо ў першай палове 1920-х гг. прасочваецца імкненне падрыхтаваць умовы для рэвізіі граніцы, якая была ўсталявана Рыжскім дагаворам.

Заходнія граніцы Польшчы былі ўсталяваны Версальскім дагаворам. Ні для каго не было сакрэтам, што ў Германіі сярод пастаноў Версальскага дагавора найбольшае незадавальненне выклікала ўключэнне ў склад Польшчы шэрагу былых германскіх тэрыторый. У сілу гэтага Польшча з'яўлялася адной з дзяржаў, найбольш зацікаўленых ва ўмацаванні і захавнні Версальскай сістэмы. Польскі міністр замежных спраў К. Скірмунт падкрэсліваў у жніўні 1921 г. у інструкцыі польскім прадстаўніцтвам за мяжой: «Аснова знешняй палітыкі – два моманты: павага дагавароў, якія завяршылі сусветную вайну, стварэнне сістэмы саюзаў з дзяржавамі, з якімі звязваюць Польшчу агульныя інтарэсы, перш за ўсё з Францыяй» [9, с. 126].

Між тым, два буйнейшых суседа Польшчы, Германія і Савецкая Расія – імкнуліся да ліквідацыі ўсталяванага Версалем парадку. Такі стан рэчаў аб'ектыўна штурхаў гэтыя дзяржавы да ўзаемнага збліжэння. Як пісаў С. Грабскі, Масква і Берлін рознымі дарогамі, скаардынаванымі, аднак, агульным планам дзейнасці, імкнуліся падарваць і знішчыць мір, усталяваны на развалінах германскага сусветнага панавання [10, с. 163]. У той жа інструкцыі К. Скірмунта адзначалася, што Польшча размешчана паміж двума ворагамі і можа быць атакована імі [9, с. 179]. Такім чынам, тое, што Савецкая Расія і Германія апынуліся ў ролі ізгоеў у рамках Версальскай сістэмы, непазбежна выклікала барацьбу з іх боку супраць гэтай сістэмы міжнародных адносін і стварала аб'ектыўныя перадумовы для напружанага становішча ў іх адносінах з Польшчай, а таксама нараджала агульную зацікаўленасць у барацьбе супраць Версаля, штурхала Германію і Расію да збліжэння. Вынікам яго стала падпісанне Рапальскага дагавора 16 красавіка 1922 г. Канцлер Вірт адзначаў, што галоўныя матывы, па якіх Германія ішла на супрацоўніцтва з Расіяй, была тая роля, якую Францыя адводзіла Польшчы ў еўрапейскай палітыцы, правы Расіі згодна артыкулу 116 Версальскага дагавора і лёс Верхняй Сілезіі [11, с. 10].

Польскія правячыя колы адразу ўбачылі ў Рапальскім дагаворы пагрозу для сваей краіны. К. Скірмунт двойчы выступаў на нарадзе ўдзельнікаў канферэнцыі з нагоды падпісання савецка-германскага дагавора і ўказваў на тое, што Польшча ў выніку Рапальскага дагавора падвяргаецца асабліва вялікай небяспецы. Ён настойваў на тым, каб краіны Антанты і іх саюзнікі занялі рашучую пазіцыю ў адносінах да савецка-германскага дагавора [12, с. 306]. Вялікую заклапочанасць у Польшчы выклікала пытанне аб тайных ваенных артыкулах у савецка-германскім пагадненні. На гэты конт у Варшаву паступалі супярэчлівыя звесткі. Пасольства ў Берліне 6 і 8 мая

інфармавала міністэрства замежных спраў (МЗС) Польшчы, што ніякай ваеннай канвенцыі паміж Расіяй і Германіяй не існуе [13, с. 38–40]. Пасольства ж у Парыжы паведамляла 11 мая, што савецка-германская ваенная канвенцыя канчаткова падрыхтавана і будзе падпісана ў бліжэйшы час [13, с. 145]. У хуткім часе польская дыпламатыя усё ж прыйшла да высновы, што тайнага ваеннага пагаднення паміж Расіяй і Германіяй не існуе. У той жа час пасол у Берліне ў адной са сваіх тэлеграм даволі трапна заўважыў, што Рапальскі дагавор з'яўляецца толькі пачаткам і адкрывае шлях для новых пагадненняў, у якіх, пры захаванні рапальскага курса, могуць знайсці адлюстраванне абавязацельствы бакоў аб узаемнай дапамозе [13, с. 40].

На наш погляд, не выклікае сумнення імкненне правячых колаў Германіі выкарыстаць супрацоўніцтва з Савецкай Расіяй у барацьбе з Версальскай сістэмай. Як адзначыў германскі пасол у Маскве У. Брокдорф-Ранцау, добрыя адносіны з СССР – галоўны сродак антыверсальскай палітыкі Германіі [14, с. 528]. У сілу склаўшайся геапалітычнай сітуацыі адным з першых аб'ектаў рэвізіі пасляваеннага статус-кво павінны былі стаць граніцы Польшчы. Як пісаў у сваіх мемуарах вядомы германскі дыпламат Г. Дзірксен, у аснове руска-германскай дружбы «ляжала сумесная нелюбоў да свайго агульнага суседа – Польшчы» [15, с. 37]. Гэты тэзіс знаходзіць пацвярджанне ў выказваннях і іншых уплывовых палітычных дзеячаў Германіі. Генерал Сект выказваўся за ліквідацыю незалежнай Польшчы і усталяванне непасрэднай граніцы з Расіяй. У мемарандуме канцлеру Вірту ад 11 верасня 1922 г. ён падкрэсліваў, што з падзеннем Польшчы знікне адзін з галоўных абаронцаў Версаля. Генерал лічыў, што дабівацца гэтага трэба з дапамогай Расіі [16, с. 39]. Канцлер Вірт падзяляў гэты пункт гледжання. У размове з прызначаным паслом у Маскву У. Брокдорф-Ранцау ён так сфармуляваў задачы германскай палітыкі ў дачыненні да Польшчы: «З Польшчай трэба канчаць. Мая палітыка імкнецца да гэтай мэты» [17, с. 153]. Праўда, ён выказаў сумненні, што ў гэтай справе можна чакаць вялікай падтрымкі з боку Расіі [18, с. 541].

Нам падаецца, што Рапальскі дагавор у першы перыяд яго дзеяння не прадстаўляў непасрэднай пагрозы для Польшчы. Расія і Германія не мелі яшчэ дастаткова сіл, каб пачаць актыўныя дзеянні. Але Рапальскі дагавор дазваляў аб'яднацца дзвюм дзяржавам, якія імкнуліся да ліквідацыі Версальскай сістэмы, што не адпавядала інтарэсам Польшчы і садзейнічала росту супярэчнасцяў у адносінах паміж краінамі Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

Новы віток у нарастанні напружаннасці ў рэгіёне адбыўся ў сувязі з рурскім крызісам. Савецкі ўрад у сваей палітыцы зыходзіў з таго, што ў выпадку падначалення Германіі французскаму ўплыву СССР пазбавіцца свайго адзінага саюзніка ў Еўропе, а Версальская сістэма набудзе дадатковую трываласць. Гэта ні у якай ступені не адпавядала інтарэсам Масквы. Такія абставіны рабілі непазбежнай прагерманскую пазіцыю СССР у час рурскага крызісу. Польшча ж была зацікаўлена ў поўнай перамозе Францыі ў рурскім крызісе, бо гэта ўмацоўвала б Версальскую сістэму. Савецкі паўпрэд у Варшаве Л. Абаленскі паведамляў аб моцным ціску Францыі на Польшчу з патрабаваннем «неадкладнай акцыі садзеяння у рурскім пытанні». Далей ён адзначаў, што Польшча не паддаецца на гэты ціск, бо баіцца савецкага умяшання [19, с. 49]. Такім чынам, савецкая падтрымка садзейнічала таму, што Германія выстаяла ў час рурскага крызісу і захавала магчымасць барацьбы з Версалем.

У ходзе рурскага крызісу Польшча выкарыстала зацікаўленасць Францыі ў ёй як у сваёй саюзніцы для атрымання міжнароднага прызнання польска-савецкай граніцы. 15 сакавіка 1923 г. Савет паслоў Антанты прыняў дадатковы пратакол да Версальскага дагавора, згодна якому ўсходнія граніцы Польшчы атрымалі міжнароднае прызнанне.

Тым самым, Рыжскі дагавор юрыдычна станавіўся часткай Версальскай сістэмы. Адпаведна, для СССР барацьба за перагляд Рыжскага дагавора яшчэ ў большай ступені перапляталася з барацьбой супраць Версаля.

Сваей кульмінацыі міжнародны крызіс ва Ўсходне-Цэнтральнай Еўропе ў сувязі з падзеямі ў Германіі дасягнуў восенню 1923 г. У канцы верасня – пачатку кастрычніка савецкае кіраўніцтва прыйшло да высновы аб непазбежнасці пралетарскай рэвалюцыі ў Германіі. Масква лічыла неабходным забяспечыць спрыяльныя міжнародныя ўмовы для яе перамогі. І тут на першы план выходзіла задача не дапусціць умяшання Польшчы ў германскія справы. Было відавочна, Польшча, заціснутая паміж савецкімі Германіяй і Расіяй, не зможа захавацца як незалежная дзяржава, адбудзецца яе саветызацыя. Таму, як адзначаў у сваёй тэлеграме ад 28 верасня ў Маскву Л. Абаленскі, у польскай палітыцы «чырвонай ніткай праходзіць імкненне ўсе намаганні накіраваць на тое, каб» перашкодзіць «змычцы» паміж рэвалюцыйнымі сіламі Германіі і Савецкай Расіі [19, с. 205–206 ].

З пачатку 1924 г. становіцца відавочным збліжэнне Германіі з Захадам. Безумоўна, для перагляду пасляваеннага статус-кво Берлін мог разлічваць на падтрымку СССР. Але ўзнікала пытанне, ці дастаткова гэтай падтрымкі для рэвізіі Версаля. У сувязі з гэтым германская дыпламатыя спрабуе праз збліжэнне з былымі праціўнікамі па вайне знайсці шляхі для перагляду некаторых найбольш непрымальных для Германіі умоў Версальскага дагавора. Нармалізацыя адносін Германіі з краінамі Захаду справядліва ўспрымалася ў Варшаве як пагроза Версальскаму дагавору і, адпаведна, польскім дзяржаўным інтарэсам. Збліжэнне Германіі з Захадам выклікала заклапочанасць і ў Маскве. Як лічыла савецкае кіраўніцтва, тым самым стваралася пагроза рапальскаму курсу. Здавалася, склаўшаяся сітуацыя стварала перадумовы для паляпшэння адносін паміж СССР і Польшчай. Аднак гэтая магчымасць не была рэалізавана. Для савецкага кіраўніцтва захаванне сяброўскіх адносін з Германіяй было прыярытэтам у знешняй палітыцы. Таму і канфлікт з Германіяй з нагоды падзей у савецкім гандлёвым прадстаўніцтве 3 мая 1924 г. быў урэгуляваны даволі хутка. Прычым, як адзначыў польскі пасол у Берліне Альхоўскі, пагаршэнне польска-савецкіх адносін у той момант не закранула адзінага пытання – адносін СССР і Германіі да Польшчы [11, с. 12]. Можна адзначыць і больш шырокую базу для савецка-германскага супрацоўніцтва ў той час. У мемарандуме савецкага ўрада ўраду Германіі ад 2 чэрвеня 1925 г. адзначалася, што ў аснове рапальскай палітыкі ляжыць маўклівае непрызнанне абодвума бакамі рэжыма, «які быў усталяваны ў Еўропе ў выніку серыі пасляваенных дагавораў» [20, с. 351]. Гэта значыць, мэтай савецка-германскага супрацоўніцтва была ліквідацыя Версальскай сістэмы. І першым элементам Версальскай сістэмы, супраць якога сумесна выступалі СССР і Германія, былі польскія граніцы.

Прадстаўнікі савецкага ўрада часам адкрыта гаварылі аб непрызнанні граніцы, усталяванай Рыжскім дагаворам. У красавіку 1924 г. бурную рэакцыю ў Польшчы выклікала заява старшыні савецкага ўкраінскага ўрада Пятроўскага аб тым, што паміж УССР і Усходняй Галіцыяй няма граніцы, а ёсць толькі часовая лінія [21, с. 22]. У жніўні польскі друк актыўна абмяркоўваў выказванне кіраўніка савецкай дэлегацыі на перамовах з Англіяй Ракоўскага, якое ўтрымлівала тэзіс аб непрызнанні ўключэння Ўсходняй Галіцыі ў склад Польшчы [22]. Сімптаматычнай у гэтым плане была заява І.Сталіна на XIV з'ездзе УКП (б) у снежні 1925 г. Ён адзначыў, што Версальскі дагавор узаконіў, акрамя іншага, «страту ўкраінскай Галіцыі і Заходняй Валыні, страту Беларуссю заходняй яе часткі, страту Літвой Вільні і іншае» [23, с. 14]. Лагічна напрошваецца вывад аб несправядлівасці гэтых страт і неабходнасці гэтую несправядлівасць выправіць.

Адзначаючы імкненне СССР і Германіі да перагляду польскіх граніц, неабходна адзначыць, што і ў польскай правячай эліце былі распаўсюджаны настроі, якія прадугледжвалі адарванне пэўных тэрыторый ад двух вялікіх суседзяў Польшчы з мэтай іх аслаблення. У адносінах да СССР гэта знайшло адлюстраванне ў палітыцы праметэізму. Яна ўключала ў сябе сакрэтныя дзеянні па падтрымцы сепаратысцкіх рухаў на нацыянальных ускраінах Расіі. У дачыненні да Германіі польскія палітыкі і ваенныя лічылі неабходным паставіць пад польскі кантроль у той ці іншай форме Ўсходнюю Прусію, якая, на іх думку, дамоклавым мячом навісала над Польшчай. У мемарандуме польскага МЗС ад 6 жніўня 1924 г. адзначалася, што немцы не пагадзяцца з Версальскім дагаворам і толькі чакаюць моманту каб аднавіць даваенныя граніцы на ўсходзе. Далей указвалася, што кардынальным спосабам забеспячэння граніц і незалежнасці Польшчы з боку Германіі «ёсць незалежнасць Усходняй Прусіі ад Прусіі і імперыі і падначаленне яе польскаму ўплыву» [9, с. 263–265].

Далейшы рост супярэчнасцяў паміж краінамі Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы звязаны з падрыхтоўкай Гарантыйнага пакта. У канцы лета 1925 г. стала відавочнай няўдача польскай дыпламатыі ў барацьбе за наданне дадатковых міжнародных гарантый германскай усходняй граніцы. Праектуемыя пагадненні адкрывалі магчымасць для Германіі паставіць пытанне аб мірным пераглядзе польска-германскай граніцы. У студзені 1925 г. МЗС Германіі быў падрыхтаваны мемарандум «Аб нямецкіх нацыянальных меншасцях», у якім у якасці першачарговых задач германскай знешняй палітыкі называлася «паступовая рэвізія ... пагранічных пастаноў па мірнаму дагавору (польскі карыдор, Верхняя Сілезія)...» [24, с. 35]. Як выцякае з гэтага дакумента, менавіта германа-польская граніца ўжо ў сярэдзіне 1920-х гг. намячалася як бліжэйшы аб'ект рэвізіі тэрытарыяльных пастаноў Версальскага дагавора. 18 мая Г. Штрэземан выступіў у рэйхстагу з прамовай, у якой падкрэсліў, што Германія не адмаўляецца ад планаў рэвізіі германа-польскай граніцы негвалтоўнымі метадамі, бо гэтая граніца супярэчыць прынцыпу самавызначэння народаў [25]. У сваіх мемуарах Г. Штрэземан прама пісаў, што Германія ў Гарантыйным дагаворы не магла даць афіцыйных гарантый граніц на ўсходзе, і павінна была пакінуць за сабой права перагляду іх мірным шляхам [26, с. 39].

Каб прымусіць Польшчу аддаць Памеранію і Верхнюю Сілезію, Германія з 15 ліпеня 1925 г. развязала супраць яе эканамічную вайну. Г. Штрэземан пісаў германскаму паслу ў Лондане 19 красавіка 1926 г.: «Мы павінны адцягваць пытанне канчатковага і трывалага аздараўлення Польшчы, пакуль гэтая краіна не саспее для перагляду граніц у адпаведнасці з нашымі патрабаваннямі...» [27, с. 249]. У пытанні аб рэвізіі польскіх граніц Германія знаходзіла паразуменне з Савецкім Саюзам. Вышэй ужо гаварылася аб заявах савецкіх палітыкаў па непрызнанню польскай граніцы. На пачаўшыхся ў снежні 1924 г. германа-савецкіх перамовах немцы прапанавалі прадметам перамоў зрабіць пытанне аб адцясненні Польшчы да яе этнічных граніц. Па даручэнню Г. Штрэзэмана пасол У. Брокдорф-Ранцау сустрэўся з Г. Чычэрыным і давёў да яго ведама ўказаны план вырашэння польскай праблемы [1, с. 132–133]. У польскай гістарыяграфіі распаўсюджаны пункт гледжання, што Г. Чычэрын з разуменнем успрыняў германскія прапановы адносна перагляду польскіх граніц [11, с. 11].

Ва ўмовах падрыхтоўкі Гарантыйнага пакта Масква была заклапочана тым, што Германія ў той ці іншай форме гарантуе заходнія граніцы Польшчы. Г. Штрэземан на сустрэчах з савецкім паўпрадам у Берліне М. Крэсцінскім 15 красавіка адзначыў намер Германіі дабівацца перагляду граніцы з Польшчай усімі мірнымі сродкамі [26, с. 512–513]. Аднак і пасля гэтага Г. Чычэрын у час знаходжання з візітам у Берліне ў пачатку

кастрычніка 1925 г. выказваў заклапочанасць у сувязі з магчымым, нават ускосным, пацверджаннем Германіяй граніцы з Польшчай. На гэта Штрэземан адказаў, што Германія ніколі не пойдзе добраахвотна на прадастаўленне гарантый Польшчы [26, с. 515]. 10 кастрычніка Г. Штрэземан накіраваў савецкаму прадстаўніцтву ў Берліне мемарандум, у якім указвалася, што аб гарантыях усходніх граніц Германіі ў праекце Гарантыйнага пакта няма і гаворкі [26, с. 512].

Савецкае кіраўніцтва дарма было заклапочана магчымымі гарантыямі для польскіх усходніх граніц. Г. Штрэземан у лісце былому кронпрынцу ад 9 верасня 1925 г. адзначаў у якасці важнейшых задач германскай знешняй палітыкі «вяртанне Данцыга, польскага карыдора і карыктыроўку граніц у Верхняй Сілезіі» [26, s. 553]. Такім чынам, германскія планы па рэвізіі германа-польскай граніцы ў сувязі з падпісаннем гарантыйнага дагавора не змяніліся. Лакарнскія пагадненні не ўрэгулявалі тэрытарыяльных спрэчак, якія існавалі ў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропе. Тое, што граніцы ў рэгіёне не атрымалі дадатковых міжнародных гарантый, падштурхоўвала і Германію, і СССР да спроб іх рэвізіі.

Такім чынам, у Цэнтральна-Ўсходняй Еўропе ўжо ў першай палове 1920-х гадоў сфарміравалася серыя вострых міжнародных супярэчнасцяў, звязаных у першую чаргу з тэрытарыяльнымі спрэчкамі паміж дзяржавамі рэгіёна і іх розным становішчам у Версальскай сістэме міжнародных адносін. У рамках гэтых супярэчнасцяў ужо тады фарміраваліся прычыны, якія прывядуць да пачатку Другой сусветнай вайны.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1. Ахтамзян, А.А. Рапалльская политика. Советско-германские отношения. 1922 – 1932 / А.А. Ахтамзян. – М.: Международные отношения, 1974. – 303 с.
2. Mikulicz, S. Od Genui do Rapallo / S. Mikulicz. – Warszawa, 1966. – 248 s.
3. Руге, В. Германия в 1917 – 1933 годах / В. Руге. – М.: Прогресс, 1974. – 320 с.
4. Руге, В. Движущие силы рапалльской политики Германии / В. Руге // Рапалльский договор и проблема мирного сосуществования. – М.: Изд. ин. лит. , 1963. – С. 85 – 105.
5. Milcke, K. Deutschland und Russland. 1914–1941 / K. Milcke. – Honnover: Miller und Fogell, 1960. – 381 s.
6. Roos, H. Polen und Europa / H. Roos. – Tüdingen, 1957. – 487 s.
7. Mackiewicz, S. Historja Polski od 11 listopada 1918 r. do 17 wrzecnia 1939 r. / S. Mackiewicz. – Warszawa: Glos, 1990. – 327 s.
8. Kawalec, K. Narodowa Demokracja wobec traktatu ryskiego / K. Kawalec // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach. – Torun, 1998.
9. Dokumenty z dziejow polskiej polityki zagranicznej 1918 – 1938.– Warszawa: Inst. Wyd. Pax., 1989. – T. 1: 1918 – 1932. - 540 s.
10. Grabski, St. Godziennych walk i rozważań / St. Grabski. – Poznań: Wielkopolska Księgarnia Nakldowa Karola Rzepenskiego, 1923. – 168 s.
11. Grosfeld, L. Polska a stosunki niemiecko-sowieckie. 1918 – 1939 / L. Grosfeld. – Warszawa: Niezalezna Oflcyna Wydawnicza, 1988. – 43 s.
12. Материалы Генуэзской конференции. – М.: Изд. НКИД, 1922. – 372 с.
13. Archiw Aktow Nowych. MSZ. – Sygn. 6629.
14. Рубинштейн, Н. Внешняя политика советского государства в 1921 – 1925 годах / Н. Рубинштейн. – М.: Госполитиздат, 1953. – 92 с.
15. Дирксен, Г. Москва, Токио, Лондон. Двадцать лет германской внешней политики / Г. Дирксен. – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2001. – 446 с.
16. Rosenfeld, G. Stosunki polityzny polsko-niemieckie po Rapallo i Lokarno / G. Rosenfeld \\ Kwartalnik historyczny. – 1963. – № 1. – S. 26 – 48.

17. Kumaniecki, J. Wobec ukladu w Rapallo / J. Kumaniecki \\ Z dziejow stosunkow polsko-radzieckich. Studzia i materially. – 1966. – Т. 2. – S. 253 – 265.
18. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до Рапалло. Сборник документов. В 2 т. – М.: Политиздат, 1971.- Т. 2. – 596 с.
19. Архив внешней политики Российской Федерации. – Ф. 04. – Оп. 32. П. 212. – Д. 52567.
20. Документы внешней политики СССР. – М.: Госполитиздат, 1967. – Т. 8. – 862 с.
21. Архив внешней политики Российской Федерации. – Ф. 04. – Оп. 32. П. 213. – Д. 52596. Т. 2.
22. Известия. 1924. 19 августа. – № 187 (2222).
23. Четырнадцатый съезд ВКП(б). Стенографический отчет. – М.: Госиздат, 1926. – 657 с.
24. Dokumente zur deutschen Geschichte 1919 – 1923. [Текст]. – Berlin: Deutscher Verl. der Wissenschaft, 1975. – 104 s.
25. Известия. 1925. 20 мая. – № 113. (2446).
26. Stresemann, G. Vermachtnis. B. 1 – 3 / G. Stresemann – Berlin, 1932. – B. 2. – 611 s.
27. Паевский, Я. Немецкие попытки натиска на Восток в период империализма / Я. Паевский // Германская экспансия в Центральной и Восточной Европе. – М.: Прогресс, 1965. – С. 237 – 251.

## ПЕРЕЖИВШИЕ: ВОСПОМИНАНИЯ МАЛОЛЕТНЕЙ УЗНИЦЫ ФАШИЗМА

***Никитенкова Л.П.***
УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», г. Брест

Устная история как особое направление исторической науки получила сегодня широкое распространение, потому что созвучна потребности нашего общества изучать недавнее прошлое через призму воспоминаний тех людей, которые были свидетелями и участниками значимых событий нашей жизни.

Одна из страниц Второй мировой войны, касающаяся людей, угнанных в Германию на принудительные работы, получила освещение только в девяностые годы прошлого столетия. Возросший интерес историков, литераторов к жизни простых людей способствовал появлению воспоминаний тех, о которых раньше и не говорили.

Моя мама, Манцивода Клавдия Константиновна, два года провела в фашистской неволе. Небольшая часть её воспоминаний опубликована в районной газете «Прамень» г. Столбцы от 10 апреля 2010 г.

Война на Дятловщину Гродненской области (в начале 40-х годов это была Барановичская область) пришла уже через неделю после её объявления. Уже в понедельник деревня Савичи, где проживала семья моей матери, была взята без выстрелов. Началась жизнь на оккупированной территории. Мама была младшей среди пятерых детей в семье Лебецких.

Она вспоминает: «Летом 1943 г. немцы начали брать молодёжь на работу в Германию. Прислали карты и в нашу деревню многим ребятам и девушкам, в том числе и моей сестре Елене, чтобы явились в Дятлово на комиссию. Никто из нашей деревни не пришёл в назначенное время, начали прятаться. Через несколько дней чуть свет окружили деревню немцы и полицаи и начали хватать кого нашли. Сначала заходили в те дома, кому были присланы карты. Мои старшие сестры успели спрятаться, а я осталась дома, так как была маленькой, худенькой, и родители не